# ЗАЙМЕННІК

Першы ўзровень

**Частка А**

**А1.** Адзначце займеннікі:
1) цэлы;
2) я;
3) яно;
4) многа;
5) наш.

**А2.** Адзначце зваротны займеннік:
1) мой;
2) хто;
3) сам;
4) сябе;
5) яны.

**А3.** Адзначце займеннікі, ужытыя ў форме давальнага склону:
1) яму;
2) ты;
3) гэтаму;
4) нечае;
5) нічога.

**А4.** Адзначце займеннікі з націскам на першым складзе:
1) нікога;
2) некага;
3) нічые;
4) нечы;
5) некаторы.

**А5.** Адзначце правільна напісаныя займеннікі:
1) ніхто;
2) абы-чый;
3) ні-чый;
4) хтосьці;
5) чыйсьці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Частка В**

**В1.** Запішыце займеннік ***я*** ў форме вінавальнага склону.

□□□□□□□□□□□

**В2.** Запішыце займеннік ***сябе*** ў форме давальнага склону.

□□□□□□□□□□□

**В3.** Запішыце займеннік ***такі*** ў форме творнага склону.

□□□□□□□□□□□

**В4.** Запішыце займеннік ***кожныя*** ў форме роднага склону.

□□□□□□□□□□□

Другі ўзровень

**Частка А**

**А1.** Адзначце займеннікі:
1) ніхто;
2) жвавы;
3) усякі;
4) гэтулькі;
5) багата.

**А2.** Адзначце ўказальныя займеннікі:
1) нішто;
2) гэтакі;
3) ён;
4) столькі;
5) той.

**А3.** Адзначце займеннікі, ужытыя ў форме творнага склону:
1) самаю;
2) самому;
3) самых;
4) нікім;
5) тых.

**А4.** Адзначце займеннікі, якія складаюцца з трох марфем:
1) нічыйго;
2) ён;
3) хто-небудзь;
4) той;
5) абы-што.

**А5.** Адзначце правільна напісаныя займеннікі:
1) чаго-сьці;
2) з абы-якім ;
3) ні з-чым;
4) штось;
5) абы-з якім.

**Частка В**

**В1.** Запішыце займеннік ***нейкі*** ў форме давальнага склону.

□□□□□□□□□□□

**В2.** Запішыце займеннік ***чые*** ў форме творнага склону.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

□□□□□□□□□□□

**В3.** Запішыце займеннік ***нічыё*** ў форме роднага склону.

□□□□□□□□□□□

**В4.** Запішыце займеннік ***якісьці*** ў форме меснага склону.

□□□□□□□□□□□

Трэці ўзровень

**Частка А**

**А1.** Адзначце займеннікі:
1) які-небудзь;
2) каторы;
3) абы-як;
4) колькі?;
5) штораз.

**А2.** Адзначце займеннікі, у якіх аснова ў назоўным склоне не супадае з асновай ва ўскосных склонах:
1) тая;
2) самы;
3) я;
4) чый;
5) мы.

**А3.** Адзначце займеннікі, ужытыя ў форме меснага склону:
1) нічыйго;
2) ні аб чым;
3) чаго;
4) (аб) нічым;
5) маю.

**А4.** Адзначце займеннікі, у якіх каранёвая марфема складаецца з адной літары:
1) цябе;
2) ніхто;
3) нас;
4) вы;
5) некаму.

**А5.** Адзначце сінтаксічныя адзінкі, у якіх ужыты правільна напісаныя займеннікі:
1) да самага вечара;
2) самому шчыраму сябру;
3) гэта быў не хто іншы, як сусед;
4) ніхто іншы не мог так спяваць, як салавей;
5) неабходна трымаць сабе ў руках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Частка В

**В1.** Перакладзіце займеннік ***кое-какой*** на беларускую мову і запішыце.

□□□□□□□□□□

**В2.** Перакладзіце займеннік ***кое-кто*** на беларускую мову і запішыце ў форме роднага склону.

□□□□□□□□□□

**В3.** Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі займеннікамі і іх сінтаксічнай роляй у сказе. Адказ запішыце.

А. У **яго** памяці ажылі ўспаміны. 1. Дапаўненне.
Б. Неўзабаве бацькі заўважылі **яго**. 2. Недапасаванае азначэнне.
В. **Мы** працуем старанна. 3. Іменная частка выказніка.
Г. Птушкі радавалі **сваімі** галасамі. 4. Дапасаванае азначэнне.
Д. Прыгоды бываюць **усякія**. 5. Дзейнік.

□□□□□□□□□□

**В4.** Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі займеннікамі і часцінамі мовы, значэнні якіх займеннікі набываюць у сказе. Адказ запішыце.

А. Мікола **сабе** толькі маўчыць. 1. Назоўнік.
Б. Вясёлка – **гэта** радасць свету. 2. Клічная часціца.
В. **Чаго** смеху поўная хата? 3. Узмацняльная часціца.
Г. **Гэта** ўсхвалявала Алесю. 4. Прыслоўе.
Д. **Якое** зорнае неба! 5. Указальная часціца.

□□□□□□□□□□

Таццяна Старасценка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ